**ДУК “Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**

# Хроніка
# культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за люты 2018 г.

## <u>Мерапрыемствы да тыдня роднай мовы</u>

***20 лютага***

Для вучняў старэйшых класаў гімназіі прайшла гадзіна беларускай мовы “Мову матчыну шануйце”. Госці ўзгадвалі гістарычны шлях беларускай мовы, чыталі вершы класікаў беларускай літаратуры. Своеасаблівую атмасферу стварылі цікавыя заданні і конкурсы, накіраваныя на кемлівасць і эрудзіраванасць вучняў. Праведзена літаратурная віктарына “Прыгарніся да роднага слова”. Упрыгожваннем мерапрыемства сталі музычныя нумары, падрыхтаваныя Касынюк Кацярынай.

ЦРБ, 35 чал.

**21 лютага**

У час правядзення вечара паэзіі “Ад вершаваных радкоў – да сэрцаў чытачоў” дзеці ўдзельнічалі ў конкурсе выразнага чытання вершаў беларускіх аўтараў, разважалі аб значэнні роднай мовы ў жыцці чалавека, ўспаміналі прыказкі і прымаўкі, выконвалі творчыя заданні, адгадвалі загадкі, вырашалі крыжаванкі.

Стрыгаўская ПБ, 29 чал.

**20 лютага**

Супрацоўнікі Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі сумесна з кінатэатрам “Радуга” правялі выступленне ЛПГ “Рытм” – “У мовы роднай – роднае карэнне”. Вядучыя падрыхтавалі расказ пра гісторыю свята, прачыталі вершы беларускіх паэтаў. Вучні прынялі ўдзел у інтэлектуальнай гульні “Моўныя скарбы роднага краю". Завяршылася мерапрыемства праглядам фільмаў “Размова пра мову” і “Якія сны сніць мядзведзь”.

Астроміцкая СШ, 70 чал.

**22 лютага**

У бібліятэцы адбылася конкурсная праграма “Квітней, родная мова”. Прысутныя праглядзелі відэаролік “Размаўляй са мной па-беларуску”. Каманды “Мовазнаўцы” і “Грамацеі” паказалі свае веды па гісторыі, культуры, літаратуры Беларусі, чыталі вершы, адгадвалі загадкі. Юнакі і дзяўчаты актыўна ўдзельнічалі ў конкурсах “Беларускі каляндар”, “Аматары беларускага фальклору”, “Мудрыя дарадцы”, “Рыфмоўкі”, “Папацей, грамацей”, “Капітан”. Удзельнікі праграмы атрымалі кніжныя закладкі з дэвізам “Беларуская – самая мая!”

Арэхаўскай ПБ, 37 чал.

**23 лютага**

Да свята беларускай мовы “Размаўляй са мной па-беларуску!” адбылося выступленне літаратурна-паэтычнай групы бібліятэкі "Мова -

крыніца ўсёй прыгажосці". Вучні Хідрынскай СШ прынялі актыўны ўдзел у конкурсе выразнага чытання вершаў беларускіх паэтаў, а навучэнцы філіяла музычнай школы выканалі "Купалінку" і "Лявоніху". Бібліятэкар прадставіла кніжную выставу, якая пазнаёміла ўсіх прысутных з творамі-юбілярамі беларускіх аўтараў 2018 года.

Хідрынская ПБ, 200 чал.

**23 лютага**

Бібліятэка правяла для юных чытачоў вясёлую граматыку "Калі ласка, запрашаем – тут мы мову вывучаем". Дзеці разважалі аб значэнні роднай мовы ў жыцці чалавека, знаёміліся з паняццем "этымалогія", праяўлялі кемлівасць і эрудыцыю ў конкурсных заданнях "Граматычнае лато", "Папацей, грамацей!", "Спрыт, знаходлівасць і розум", ўспаміналі прыказкі і прымаўкі, абмяркоўвалі пастулаты народнай мудрасці сваіх продкаў. У завяршэнні хлопчыкі і дзяўчынкі паспрабавалі з дапамогай слоўнікаў перакласці словы з рускай мовы на беларускую і наадварот.

Гарадзецкі філіял, 34 чал.

## Мерапрыемствы да Дня абаронцаў Айчыны

**14 лютага**

Гасцямі пасяджэння клуба "Час і ты", прысвечанага Дню памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў "Души, опаленные Афганистаном" сталі навучэнцы Кобрынскага дзяржаўнага політэхнічнага каледжа. Вядучыя расказалі аб вайне ў Афганістане, паказалі дакументальны ролік "Салдаты неаб'яўленай вайны". Успамінамі пра свой удзел у ваенных дзеяннях на тэрыторыі Афганістана падзяліўся старшы прапаршчык Старун Фёдар Аляксандравіч. Музычным упрыгожаннем мерапрыемства стала выступленне мясцовага барда Харэвіча Ю.В., які выканаў аўтарскія песні.

ЦРБ, 36 чал.

**16 лютага**

У час літаратурна-музычнай кампазіцыі "Афганистан. Без права забыть" адбылося выступленне літаратурна-паэтычнай групы "Родник". Удзельнікі мерапрыемства расказалі гледачам пра вайну, пра салдат-землякоў, якія ваявалі ў Афганістане, прачыталі вершы. Прысутныя прагледзелі відэапрэзентацыю "Время выбрало их". Бібліятэкарам прапанавана выстава-памяць "Память живет в сердцах".

Батчынская ПБ, 95 чал.

**23 лютага**

На літаратурна-музычную кампазіцыю "Во славу мужества и стойкости!" запрошана мужчынская палова Кобрынскай РООО "БелТІЗ".

З віншавальным словам выступіла старшыня арганізацыі В. Н. Смяховіч, якая ўручыла мужчынам памятныя падарункі і прызы за ўдзел у тэматычнай віктарыне. Выступленне вядучых суправаджала відэапрэзентацыя, якая нагадала пра подзвігі салдат розных перыядаў гісторыі нашай краіны.

Гучнымі апладысментамі і словамі падзякі сустрэлі гледачы музычныя нумары, падрыхтаваныя вакальнай групай цэнтральнай бібліятэкі.

ЦРБ, 42 чал.

**26 лютага**

У час конкурснай праграмы “Мы защитниками станем” бібліятэкар пазнаёміла прысутных з гісторыяй памятнай даты, юныя ўдзельніцы мерапрыемства павіншавалі хлопчыкаў са святам. Будучыя абаронцы Бацькаўшчыны прадэманстравалі прысутным спрыт, адвагу, кемлівасць і веды. Па выніках конкурсаў ўсе ўдзельнікі ўзнагароджаны заслужанымі прызамі. Прысутным прапанаваны фотадакументальная выстава “Стоит на страже Родины солдат” і кніжная выстава “О мужестве, о Родине, о славе”.

Батчынская, 65 чал.

## Іншыя мерапрыемствы

**5 лютага**

У інфармацыйна-сэрвісным цэнтры цэнтральнай раённай бібліятэкі для навучэнцаў гімназіі прайшла інфармацыйна-пазнавальная гадзіна “Молодежные субкультуры”. У ходзе мерапрыемства юнакі і дзяўчаты пазналі пра разнастайнасць сучасных моладзёжных плыняў, станоўчых і адмоўных выніках дзеянняў субкультур, пазнаёміліся з паняццем “субкультура”.

ЦРБ, 17 чал.

**11 лютага**

У рамках культурна-дасугавага праекту “Территория интеллекта” стартаваў сінхронны турнір гульні “Что? Где? Когда?” – “Шаровая молния-2”. У турніры спаборнічалі 4 каманды эрудытаў г. Кобрына: “Эффект Доплера”, “Старики-разбойники”, “L&G” і каманда “Особое мнение” з г. Бяроза. У напружанай барацьбе першае месца заняла каманда “Эффект Доплера”.

ЦРБ, 32 чал.

**13 лютага**

Бібліятэка арганізавала сустрэчу з кандыдатамі ў дэпутаты мясцовых Саветаў. Падчас сустрэчы выбаршчыкі выказвалі свае думкі, давалі наказы будучым дэпутатам. Бібліятэкарам падрыхтавана кніжная выстава "Делать выбор осознанно". Святочную канцэртную праграму падрыхтаваў аўтаклуб.

Тевельская ПБ, 35 чал.

**14 лютага**

На фальклорных вячорках "Масленица - праздник весны, солнца, жизни", якія арганізавалі бібліятэкары, адбылося знаёмства чытачоў з гісторыяй свята, традыцыямі яго правядзення. Госці дзяліліся рэцэптамі масленічных бліноў, прымалі актыўны ўдзел у розных гульнях. Прысутныя прагледзелі відэапрэзентацыю “Сударыня – Масленица”. На працягу ўсяго мерапрыемства госці частаваліся блінамі з рознымі начынкамі.

Гарадзецкі філіял, 22 чал.

**13 лютага**

У інфармацыйна-сэрвісным цэнтры прайшла літаратурна-музычная кампазіцыя “Все начинается с любви”. Удзельнікі мерапрыемства даведаліся шмат цікавага пра гісторыю, звычаі, традыцыі свята, пра тое, як святкуецца гэты дзень у розных краінах, пра падзеі, якія папярэднічалі з'яўленню першых паштовак – валянцінак, актыўна адказвалі на пытанні святочнай віктарыны “Коротко о любви”.

ЦРБ, 25 чал.

**16 лютага**

Пазнавальна-забаўляльнай праграмай "Всё о масленице" адкрыўся масленічны тыдзень у бібліятэцы. Бібліятэкар правяла агляд фальклорных і краязнаўчых выданняў ля кніжнай выставы "Как на Масленой неделе...". Дзеці даведаліся пра значэнне кожнага дня Масленіцы, ўдзельнічалі ў конкурсе загадак і прыказак і ў вырабе папяровых лялек "Масленицы". Потым юных чытачоў запрасілі за стол з масленічнымі блінамі і гарбатай.

Хідрінская ПБ, 23 чал.

**22 лютага**

Бібліятэкар Дзівінскага філіяла прыняла ўдзел ва ўступнай канферэнцыі міжнароднага праекту "Через изучение культуры соседнего народа – к укреплению партнёрства и взаимопонимания", які рэалізуецца пры фінансавай падтрымцы Еўрапейскага Саюзу ў рамках Праграмы тэрытарыяльнага супрацоўніцтва краін Усходняга партнёрства "Беларусь-Украіна" (Забалоцце, Ратнаўскі раён Валынскай вобласці, Украіна).

**25 лютага**

У рамках праекту “Территория интеллекта” адбыўся чарговы турнір інтэлектуальнай гульні “Что? Где? Когда?” “Балтийский берег”. У турніры спаборнічалі 4 каманды эрудытаў г. Кобрына: “Эффект Доплера”, “Старики-разбойники”, “L&G”, “Пингвины” і каманда “Особое мнение” з г. Бяроза. У напружанай барацьбе першае месца заняла каманда “Старики-разбойники”. Вядучы гульні - Кузьміч В.С.

ЦРБ, 16 чал.

Выканаўца Міхейкіна-Белякова А. М.
Тэл. 2 36 81